# З прамовы т. Чарвякова на адчыненьні IV сэсіі ЦВК БССР

Таварышы IУ сэсія Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі пачынае сваю работу ў той гістарычны пэрыяд, калі рабочая кляса і працоўныя масы Савецкай Беларусі, разам з рабочай клясай і працоўнымі масамі Савецкага саюзу, пад кіраўніцтвам компартыі разгортваюць работу па выкананьні задач першага году другой пяцігодкі —пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва ў Савецкім саюзе.

Мы змаглі прыступіць да вырашэньня гэтых задач дзякуючы вялізарным посьпехам сацыялістычнага будаўніцтва ў першую пяцігодку, якую скончылі за чатыры гады.

Савецкая Беларусь у барацьбе за выкананьне першай пяцігодкі ня толькі не адставала ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, але па цэламу раду галін ішла ўперадзе гэтых сярэдніх агульнасаюзных тэмпаў. І таму мы маем магчымасьць сёньня адзначыць вялізарныя посьпехі гаспадарчага і культурнага сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай Беларусі, дзякуючы якім Савецкая Беларусь ператварылася з краіны аграрнай у краіну індустрыяльную, з краіны з дробнай сельскай гаспадаркай у краіну буйной сельскай гаспадаркі, з краіны прыватнай сельскай гаспадаркі ў краіну сацыялістычнай гаспадаркі, з краіны някультурнай, няпісьменнай у краіну суцэльна пісьменную, у краіну ўсеагульнага абавязковага навучаньня, у краіну з пышным росквітам вышэйшай і сярэдняй тэхнічнай асьветы, у краіну, дзе будуецца сацыялізм, дзе ствараецца новая культура [illegible]

быць зьвернута на тое, што ад іх непасрэднай работы, ад якасьці гэтай работы, залежыць пасьпяховае вырашэньне гэтай важнейшай задачы.

У часе загатоўчай кампаніі, калі мы непасрэдна пайшлі ў вёску, калі мы прад'явілі сельскай гаспадарцы патрабаваньне аб выкананьні ёю сваіх абавязкаў перад дзяржавай, мы сустрэліся з радам нездаровых зьявіщч і недахопаў у нашай рабоце на вёсцы. Урокі загатовак на Савецкай Беларусі воў-



пядбайнасьці, нашай непаваротлівасьці, нашага няўменьня перабудаваць работу, нашай невыстарчальнай бальшавіцкай цільнасьці для таго, каб замацаваць свае позыцыі, для таго, каб разьвіваць сваю контр-рэволюцыйную работу, накіраваную на зрыў соцыялістычнага будаўніцтва. Адсюль мы павінны зрабіць вывад: з бальшавіцкай простасьцю разгорнем крытыку і самакрытыку, выправім недахопы сваёй работы, каб іх зьнішчыць, каб гэтым нанесьці руйнавальны ўдар па клясаваму ворагу.

У парадак дня гэтай сэсіі пастаўлены таксама даклады Жыткавіцкага і Крупскага раённых выканаўчых камітэтаў аб масавай рабоце саветаў.

Новыя абставіны, выклікаючы новыя абвастрэньні клясавай барацьбы, патрабуюць яшчэ большага ўзмацненьня органаў дыктатуры пралетарыяту, і мы павінны прыняць усе меры да таго, каб узмацніць саветы. Мы павінны вывучыць гэтыя прыклады новых форм работы, якімі карысталіся практычныя работнікі на мясцох, для таго, каб гэтыя добрыя прыклады перанесьці на ўсе іншыя саветы, каб праз гэта зрабіць савеьты сапраўднымі змагарамі за генэральную лінію партыі ня толькі ў дэклярацыях, ня толькі ў рэзолюцыях, ня толькі на словах, але і на практычнай справе, на барацьбе за выкананьне задач першага году другой пяцігодкі.

Я хачу зьвярнуць асаблівую ўвагу сэсіі на тое, што ў Савецкай Беларусі, як у нацыянальнай рэспубліцы, клясавы вораг вельмі часта імкнецца прыкрываць сваю контр-рэволюцыйную барацьбу фальшыва-нацыянальным сьцягам.

Комуністычная партыя, рабочая кля-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы